смотреть); повышение простоты и доступности услуг для гостя (широко используется технология идентификации с помощью магнитных и чиповых карт, электронная дактилоскопия; задача подобных средств — дать возможность гостю не думать о количестве наличных в кошельке и избавить его от необходимости носить с собой кредитные карты); системы бэк офиса должны быть консолидированы (это требуется для четкого понимания контроля и получения полной информации о работе гостиницы; современные системы управления обеспечивают экспорт данных по всем расходам гостя в бэк офисные системы гостиницы); обеспечение высокой отдачи и бесперебойной работы систем.

***Н.У. Савіна**, канд. філал. навук, дацэнт*
*БДЭУ (Мінск)*

## РАЗВІЦЦЁ ЭТНАГРАФІЧНА-ФАЛЬКЛОРНАГА ТУРЫЗМУ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ ВА ЎМОВАХ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ

Акрэсленая назвай праблема актуальная для развіцця турыстычнай індустрыі Рэспублікі Беларусь у цэлым. Як паказвае практыка, найбольшую зацікаўленасць турыстаў і экскурсантаў на сучасным этапе развіцця турызму выклікае матэрыяльная і духоўная спадчына этнасу.

Прэзентацыя экскурсаводам, гідам праз аповяд (вусную форму экскурсійнага тэксту) жыццясцвярджальных свят беларускага народа, яго традыцый, звычаяў, вераванняў спрыяе далучэнню турыстаў і экскурсантаў да традыцыйнай народнай культуры.

У гэтым рэчышчы асаблівую значнасць набываюць пытанні развіцця этнаграфічна-фальклорнага турызму, пад якім разумеецца від культурнага (культурна-пазнавальнага, пазнавальнага) турызму, мэта якога — наведванне аб'ектаў матэрыяльнай і духоўнай культуры народа. Акрэсленнае азначэнне ва ўмовах глабалізацыі патрабуе навукова-практычнага ўдакладнення.

Дэфініцыя тэрміна «этнаграфія» (ад гр. $\varepsilon\theta\nu o\varsigma$ — народ і $\gamma\rho\alpha\varphi\omega$ — пішу) тлумачыцца, па-першае, як навука, якая вывучае матэрыяльную і духоўную культуру народаў, па-другое, як сукупнасць асаблівасцяў быту, нораваў, звычаяў, культуру якога-небудзь народа або мясцовасці. Для зручнасці і дасканалага даследавання падзел культуры на духоўную і матэрыяльную носіць умоўны характар, паколькі ўсё, што створана чалавекам, — ад велічных помнікаў архітэктуры да сплеценага з лазы кошыка, уяўляе сабой духоўна асветленую творчасць.

Зыходзячы з рэкамендацый, прынятых Камітэтам па захаванню фальклору ЮНЕСКА (15 лістапада 1989 г., Парыж, 25-я сесія Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА), дэфініцыя тэрміна «фальклор» (ад англ. *folklore* — народная мудрасць) разглядаецца як традыцыйная і народная культура і тлумачыцца як сукупнасць твораў (выражаных групай або індывідуумамі), заснаваных на традыцыях культурнага

суіснавання і прызнаных у якасці адлюстравання спадзяванняў грамадства, яго культурнай і сацыяльнай самабытнасці. Формы фальклору ўключаюць наступныя віды мастацкай творчасці: мову, літаратуру, музыку, танцы, гульні, міфалогію, звычаі, абрады, рамёствы і інш., якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне рознымі спосабамі (вусна, шляхам імітацыі, праз пэўныя помнікі).

Асновай этнаграфічна-фальклорнага (этнаграфічнага) турызму з'яўляецца экскурсія этнаграфічнай тэматыкі, аб'екты паказу якой ўвасабляюць пэўныя этнакультурныя традыцыі. Сярод іх гісторыка-культурныя помнікі; гістарычныя мясціны, звязаныя з міфалагічнымі светаўяўленнямі, са старажытнымі язычніцкімі культамі; святы, абрады, традыцыі, народныя рамёствы і інш., што ўваходзіць у рэкамендаванае ЮНЕСКА азначэнне фальклору. Акрэслены зрокавы рад экскурсіі дае каштоўнейшую інфармацыю пра гістарычную мінуўшчыну і / ці культурныя плыні сучаснага грамадства, спрыяе ажыццяўленню мэтавых функцый: выхаваўчых, эстэтычных, пазнавальна-абрадавых, духоўна-рэлігійных, камунікатыўных, сацыяльна-псіхалагічных, навукова-вучэбных і утылітарна-практычных.

Як займальна-вобразная форма пазнання навакольнага свету экскурсія этнаграфічнай тэматыкі (з улікам рознай катэгорыі турыстаў і экскурсантаў) стварае амаль неабмежаваную магчымасць судакранення з вопытам і назапашанай сістэмай ведаў продкаў, садзейнічае выхаванню нашчадкаў у адпаведнасці з нацыянальнымі традыцыямі, нормамі маралі, фарміруе прывабны нацыянальна-дзяржаўны імідж Рэспублікі Беларусь у свеце, спрыяе пераадоленню адчужэння і раз'яднанасці быцця чалавека ва ўмовах глабалізацыі.

***Т.А. Сардаров,*** *д-р философии по экон. наукам*
*Ин-т экономики НАН Азербайджана (Баку)*

# НАПРАВЛЕНИЯ РЕГУЛИРОВАНИЯ СОЦИАЛЬНОЙ ИНФРАСТРУКТУРЫ В СФЕРЕ ТУРИЗМА В АЗЕРБАЙДЖАНЕ

Под словом «туризм» понимается большой сектор экономики. По роли, занимаемой в современной мировой экономике, туризм превратился в индустрию, конкурирующую с нефтедобывающей и автомобилестроительной промышленностью. И с точки зрения социального развития общества значение туризма очень велико. Развитие туризма в отдельных регионах в целом по стране создает выгодные условия для решения многих социально-экономических проблем. С развитием туризма становится возможным открытие новых рабочих мест, предотвращение хартического оттока сельского населения в города, рост коммуникационных и культурных связей населения. В регионах, где развивается туризм, создаются выгодные условия для усиления межкультурной интеграции.